**Глінская Л.І. (Мінск)**

## Сакральны свет маці і дзіцяці ў жыцці і творчасці Максіма Багдановіча

Існуе меркаванне, што чалавек мае толькі адзін лёс, запісаны Богам у кнігу быцця, і ён нікім не можа быць зменены. «Чаму быць, таго не мінаваць», «Ад лёсу нікуды не дзенешся», – як часта чуем мы ў паўсядзённым жыцці гэтыя звыклыя формулы і толькі па-сапраўднаму пачынаем асэнсоўваць іх, калі задумваемся аб лёсе канкрэтных людзей.

Максім Багдановіч. Як, сапраўды, незайздросна склалася яго жыццё. Яшчэ ў раннім дзяцінстве страціў маці, не паспеўшы нацешыцца яе ласкай і пяшчотай. На доўгія гады адарваны ад Беларусі, ён усім сэрцам, усёй душой імкнуўся на радзіму і толькі напрыканцы жыцця атрымаў поўнае права называцца сынам зямлі беларускай. Цяжка хворы на сухоты, ён свята верыў у тое, што родная зямля вылечыць яго хворыя грудзі, а калі не, дык хоць будзе пахаваны ў ёй, але і гэтага яму не было дадзена. Як той лермантаўскі дубовы лісток, адарваны ад роднай галінкі, памёр Максім на чужыне, у Ялце. І ніхто з блізкіх, родных яму людзей не прыйшоў правесці сына, брата, паэта ў апошні шлях: «Добрыя, удумлівыя вочы / З павалокай болю і тугі. / Ты для нас загадкай застанешся, / Мудры і заўсёды малады…» [2, с. 134].

Шмат загадак пакінуў пасля сябе Максім Кніжнік, і найпершая з іх: чаму так трагічна склаўся яго лёс. Максім, па сведчаннях знаёмых яму людзей, не любіў гаварыць пра сваю хваробу, якая з кожным днём усё больш падточвала здароўе. Жыццялюб па натуры, чалавек, які ўмеў бачыць у паўсядзённым жыцці прыгожае, малады М. Багдановіч імкнуўся зразумець гэтае зямное жыццё з самых першых момантаў яго ўзнікнення. І не дзіва, што пазнаёміўшыся блізка з сям'ёю свайго гімназісцкага таварыша Дзіадора Дзябольскага, Максім з вялікай увагай і пашанай ставіўся да жонкі старэйшага брата свайго сябра, Марыі Іванаўны, на той час цяжарнай. Думаецца, шмат пра што даведаўся паэт ад сваёй бабкі па бацькавай лініі, Анэлі Багдановіч, якая была вядома як захавальніца народнай даўніны: абрадаў, звычаяў, гаданняў, казак і паданняў, прыказак і прымавак, народных лекавых сродкаў.

У славянскім фальклоры цяжарная жанчына часта параўноўвалася з зямлёй, што чакае ўраджаю. Было распаўсюджана таксама ўяўленне, што чалавек развіваецца ў лоне маці, як кураня ў яйку. Яйка, своеасаблівы лонаплод, з'яўляецца праяўленнем біяцыкламатрыцы – прынцыпова правільнай мадэлі будовы і развіцця Сусвету. Старажытным мудрацом такі лонаплод у іншасказальным плане бачыўся «белым каменем», «філасофскім каменем», «Граалем», «Яйкам сусвету». М. Багдановіч, выхаваны на творах сусветнай класікі і філасофіі, безумоўна, меў уяўленне аб гэтых сакральных паняццях і таму ў «Трыялеце» («Дзераўлянае яечка…)», які ўвайшоў у нізку «Каханне і смерць», напісаў: «Дзераўлянае яечка / Ты ўдаеш сабой зусім. / Адчыні яго, – а ў ім / Дзераўлянае яечка. / Гэтак сама чалавечка / Затаіўшы ў нетрах, тым / Дзераўлянае яечка / Ты ўдаеш сабой зусім» [1, с. 158].

Момант зачацця ў нашых продкаў лічыўся вельмі важным для будучага дзіцяці, бо менавіта ён вызначаў яго далейшы лёс. Людзі верылі, што дзіця будзе працавітым, здаровым, прыгожым, вясёлым і разумным, калі яго зачацце адбудзецца ў шчаслівы дзень і ў шчаслівы час сутак. Лёс дзяцей, зачатых у

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

забаронены, нядобры час, будзе няшчасным. Асабліва небяспечнымі лічыліся вялікія гадавыя святы, нядзеля, памінальныя дні, гадавыя пасты і посныя дні (серада і пятніца).

Жанчыне, якая выношвала дзіця, патрэбна было кантраляваць свае эмоцыі, быць у добрым настроі. Яна не мела права пакрыўдзіць чалавека ці жывёлу, насмяяцца з убогага. Цяжарным нельга было выходзіць на вуліцу пасля заходу сонца, праводзіць пакойніка да магілы, цалаваць яго, прысутнічаць на памінках, глядзець на пажар, пераступаць праз вяроўку або каромысла. Лічылася, што парушэнне гэтых правіл можа прынесці дзіцяці няшчасце. І, мусіць, невыпадкова ў нізцы «Каханне і смерць» з'явіўся верш «Пракляцце вагітнай»: «К твайму аконцу каля ганка / Падходзіць варажыць цыганка / Ў лахмане зрэбным і нячыстым / Са срэбрам ззяючым маністам. / І, чуючы твае адмовы, / Шыпіць праклляцця злыя словы / З паглядам у пагляд упёртым: / «Каб ты дзіцё радзіла мёртвым!» / І, засмяяўшыся нясмела, / Ты задрыжэла і збляднела» [1, с. 160].

Чалавек нараджаецца на свет у пакутах, такім чынам ён плоціць за грэхападзенне Адама і Евы. «З енкам дзіцё ты раджаеш, / Болю не змогшы сцярпець. / Стогнамі сэрца ўражаеш… / Што я магу зразумець? / Шчыра мяне ты любіла, / Шчыра цябе я кахаў. / Але давёў да магілы. / Сам на мучэнні аддаў» [1, с. 161]. Вядома, што праваслаўная царква не застаецца абыякавай да людскіх пакут. Здольнасць да дзетанараджэння лічыцца вялікім дарам Божым, а плод лона – за ўзнагароду: «Без сіл, уся ў поту, / Як белы снег блядна, / На злітаю крывёй і ўзмятай караваці / Ляжыць шчаслівая і жалкая яна, / І аб адным у ёй цяпер дума: «Я – маці». / Яна збялела ўся. / Ёй, можа, ўжо не жыць. / І ўсё ж ткі радасцю бязмежнай ззяюць вочы. / А на яе тугіх грудзях ужо ляжыць / Чырвоны, цёпленькі і неяк смешна смокча» [1, с. 162].

У нашых продкаў, усходніх славян, назіраліся дваістыя адносіны да родаў. З аднаго боку, нараджэнне чалавека ўспрымалася як вялікая таямніца, як рэалізацыя Божага памыслу: «Божая прыбыль», «Дзеці – дар Божы». З другога – акт нараджэння лічыўся сакральна нячыстым, што тлумачылася верай у грахоўнасць фізічных зносінаў мужчыны і жанчыны. Гэтая дваістасць адчуваецца ў вершы М. Багдановіча «Пачуццю цёмнаму падлеглая»: «Ты ўжо рассталася з уборам / І ў ложа шлюбнае лягла, / Свой сорам, свой жаноцкі сорам, / Дрыжачая, перамагла. / І ведаеш, – табе мучэнні / І нават мо канец жыцця / Сабой накліча пры раджэнні, / Ірвучыся на свет, дзіця. / Ды абяссіленай душою / Ты можаш аднаго жадаць, – / Каб семя бурнае мускае / У нетрах цела пахаваць. / Тамсама без надзей да спыну / У пропасць чалавек ляціць / І сквапна ўніз, на дно страмніны, / З салодкай жудасцю глядзіць» [1, с. 155].

Два вобразы сталі ў творчасці паэта вызначальнымі: той, хто дае жыццё, і той, хто працягвае жыццё, – маці і дзіця. Цыкл вершаў «Каханне і смерць» гучыць як песня славы тым, хто гатовы загінуць у імя прадаўжэння жыцця на зямлі: «Слава тым, хто сілу мае / Смерць не дрыгнуўшы спаткаць, / Хто ў мучэннях памірае, / Каб жыццё дзіцёнку даць!» [1, с. 165].

М. Багдановіч не мог не напісаць гэтыя радкі. Ён нібы ўсведамляў свой абавязак перад маці, Марыяй Апанасаўнай, перад другой жонкай свайго бацькі – Аляксандрай Паўлаўнай Волжынай, якая таксама памерла ад родаў. Па словах

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

бацькі паэта, Адама Ягоравіча, у Максіма былі ўзвышаныя погляды на жанчыну, без налёту эротыкі, што вылучала яго сярод маладых людзей свайго пакалення: «Мадонна – вось той вобраз і той ідэал, у якім ён уяўляў сабе жанчыну – вобраз чысціні і нявіннасці, які ўсё ж увасабляе сабой два пачаткі – жаноцкасць і мацярынства» [3, с. 49]. Гэта назіраецца ў творах «Мадонна», «Вераніка», «У вёсцы». Успрыняўшы класічнае пакланенне перад жанчынай як багіняй (Беатрычэ ў Дантэ, Лаўра ў Петраркі, Незнаёмка ў Блока), М. Багдановіч знаходзіць боскія рысы ў зямной жанчыне – дзяўчыне, дзяўчынцы.

М. Багдановіч атрымаў у спадчыну ад маці высакародны розум і ўзнёслае сэрца, ад бацькі – упартасць, вялікую працаздольнасць і мэтанакіраванасць. На жаль, лёс распарадзіўся так, што лепшае, што паэт набыў ад сваіх бацькоў, яму не было каму перадаць. Але была ў М. Багдановіча радзіма, Беларусь, якую ён і асацыіраваў са словам «маці». Была ў яго багатая, высокамастацкая слоўная творчасць, якая, нібы тая пупавіна, звязвала яго з радзімай-маці.

**Літаратура**


1. Багдановіч, М. Поўны збор твораў : у 3 т. / М. Багдановіч. – Мінск, 1992–1995. – Т. 1 : Вершы, паэмы, пераклады, наследаванні, чарнавыя накіды. – 1992.
2. Глінская, Л. Летуценні : вершы / Л. Глінская. – Мінск, 2001.
3. Шлях паэта : успаміны і біяграфічныя матэрыялы пра Максіма Багдановіча. – Мінск, 1975.


РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ